РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. СУБОТА № 197 (30585)

# «АБСАЛЮТНЫ ПРЫЯРЫТЭТ — ГЭТА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ БЯСПЕКІ І ЗАХАВАННЕ МІРУ НА ПРАСТОРЫ САДРУЖНАСЦІ»



**Аб чым Аляксандр Лукашэнка гаварыў на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, якое праходзіла ў Душанбэ**

Фота БелТА.

Пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД праходзіла спачатку ў вузкім, пасля ў шырокім складзе. На разгляд лідараў Садружнасці было вынесена каля двух дзясяткаў пытанняў. Яны датычыліся стварэння фармату «СНД плюс», энергетычнай бяспекі, супрацоўніцтва ў ваеннай сферы, у галіне пагранічнай бяспекі, барацьбы з транснацыянальнай злачыннасцю, іншых надзённых для Садружнасці тэм.

У сваім выступленні Прэзідэнт Беларусі закрануў самыя актуальныя з іх, як заўсёды, не толькі ўзняўшы праблемы, але і прапанаваўшы шляхі іх вырашэння.

СТАР. 2–4

ВТІ-2025: ІНАВАЦЫІ БЕЛАРУСКІХ ДЫЗАЙНЕРАЎ 8–9



СКАЖЫЦЕ «НЕ» ТРЫВОЗЕ І ДЭПРЭСІІ 14



**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ

## ШАНУЙЦЕ ХАТУ! ЛЕТАМ І ЗІМОЙ...

**Тады, нават пакідаючы жыллё на працяглы час, вы зможаце быць упэўненымі ў яго захаванасці**



«Мінчанка Г., прыйшоўшы дадому пасля працоўнага дня, убачыла ўзламаныя ўваходныя дзверы, а з кватэры зніклі дарагія рэчы і ўпрыгажэнні»; «грамадзянін І. пасля сустрэчы з выпадковымі знаёмымі выявіў прапажу тэлевізара, сотавага тэлефона»... Гэтыя радкі — не плён журналісцкага ўяўлення дзеля прыцягнення чытача і не пачатак чарговага дэтэктыва. Гэта рэальныя факты, зафіксаваныя ў крымінальных справах.

СТАР. 12

ISSN 1990 — 763X

# «АБСАЛЮТНЫ ПРЫЯРЫТЭТ — І ЗАХАВАННЕ МІРУ



## «НЕ ТОЛЬКІ КАНСТАТАЦЫЯ РЫЗЫК І АНАЛІЗ МАГЧЫМАСЦЯЎ, АЛЕ І ВЫПРАЦОЎКА КАНКРЭТНЫХ МЕХАНІЗМАЎ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ»

Выступаючы на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД у вузкім фармаце, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што процідзеянне тэрарызму, умацаванне надзейнасці граніц, барацьба з транснацыянальнай злачыннасцю даўно перастала быць задачамі асобных ведамстваў, стаўшы кампанентамі нацыянальнай бяспекі кожнай з дзяржаў СНД. Паводле слоў Прэзідэнта, шырокі парадак дня пасяджэння — прамое пацвярджэнне таму, што сучасныя пагрозы датычацца ўсіх.

«Мы з'яўляемся сведкамі і ўдзельнікамі тэктанічных геапалітычных працэсаў, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Для кагосьці яны азначаюць цяжкае і крыўднае прывыкання... дзенне амбіцый у адпаведнасць з рэальнымі магчымасцямі. Для нашай жа Еўразіі яны неабходны, хоць і балючы этап на шляху да росту глабальнай ролі і ўмацавання статусу аднаго з найважнейшых палітыка-эканамічных цэнтраў шматпалярнага свету».

Беларускі лідар выказаў упэўненасць, што агульныя выклікі патрабуюць максімальнай скаардынаванасці і выкарыстання ўсяго патэнцыялу СНД. «Таму наша сённяшняя мэта — не толькі канстатацыя рызык і аналіз магчымасцяў, але і выпрацоўка канкрэтных механізмаў узаемадзеяння, якія практычна рэалізоўваюцца», — канкрэтызаваў ён.

## «МЫ НЕ ПАВІННЫ ДАПУСЦІЦЬ, КАБ ДЗЯРЖАВЫ СНД АКАЗАЛІСЯ ЎЦЯГНУТЫ Ў НЕБЯСПЕЧНЫЯ АВАНТУРЫ»

**Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на некалькіх ключавых стратэгічных кірунках у дзейнасці СНД.**

**«Першае:** абсалютны прыярытэт — гэта забеспячэнне бяспекі і захаванне міру на прасторы Садружнасці, — заявіў Прэзідэнт. — Мы не павінны дапусціць, каб дзяржавы СНД аказаліся ўцягнутымі ў небяспечныя авантуры, якія пагражаюць як нашаму рэгіёну, так і ўсяму чалавецтву».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што галіновыя саветы СНД, якія дзейнічаюць у сферы бяспекі, аператыўна рэагуюць на выклікі і пагрозы, што ўзнікаюць. «З іх падачы мы сёння прымем вельмі важныя рашэнні і дакументы: праграмы супрацоўніцтва ў сферы процідзеяння тэрарызму і экстрэмізму на 2026—2028 гады, у сферы ўмацавання пагранічнай бяспекі на знешніх граніцах на 2026—2030 гады, Канцэпцыю ваеннага супрацоўніцтва да 2030 года», — удакладніў ён.

Прэзідэнт дадаў, што Беларусь чакае актыўнага ўдзелу прадстаўнікоў Садружнасці ў трэцяй Мінскай канферэнцыі высокага ўзроўню па еўразійскай бяспецы, якая запланавана на канец кастрычніка. Звяртаючыся да калег, Аляксандр Лукашэнка папрасіў дасылаць прадстаўнікоў высокага ўзроўню на гэту канферэнцыю.

«Мы вельмі шмат гаворым, што ў нас ёсць Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, — канстатаваў ён. — Але на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў калі мы збіраліся? Калі мы абмяркоўвалі пытанні бяспекі? Калі мы, гледзячы адзін аднаму ў вочы, маглі сказаць тое, пра што мы думаем?»

Па словах беларускага лідара, Мінская канферэнцыя высокага ўзроўню па еўразійскай бяспецы якраз можа садзейнічаць такому адкрытаму дыялогу.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Дакументы з задзелам на будучыню

Па выніках саміту Садружнасці ў Душанбэ лідары дзяржаў — удзельніц СНД падпісалі пакет дакументаў. Кіраўнікі дзяржаў Садружнасці прынялі рашэнні аб заснаванні новага фармату — «СНД плюс» — і надзяленні ШАС статусам назіральніка пры СНД. «СНД плюс» стане платформай для супрацоўніцтва краін Садружнасці з іншымі дзяржавамі, іх аб'яднаннямі і міжнароднымі арганізацыямі, зацікаўленымі ва ўстанаўленні ўзаемадзеяння з СНД па кірунках, якія ўяўляюць узаемную цікавасць.

Сярод дакументаў, прынятых па выніках саміту, — Дэкларацыя аб супрацоўніцтве ў сферы забеспячэння рэгіянальнай энергетычнай бяспекі. Дакумент з'яўляецца стратэгічнай асновай для развіцця ўзаемаадносін паміж дзяржавамі па забеспячэнні рэгіянальнай энергетычнай бяспекі.

Акрамя таго, на саміце зацверджаны Канцэпцыя ваеннага супрацоўніцтва дзяржаў СНД да 2030 года, праграма супрацоўніцтва дзяржаў Садружнасці ва ўмацаванні пагранічнай бяспекі на знешніх граніцах на 2026—2030 гады, праграма супрацоўніцтва ў сферы процідзеяння тэрарызму і экстрэмізму, шэраг іншых дакументаў.

Сярод рашэнняў і заяў, прынятых па выніках саміту, — сумесныя заявы ў гонар 80-й гадавіны стварэння ААН і ў сувязі з 40-й гадавінай аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Рашэннем лідараў краін Садружнасці Сяргей Лебедзеў прызначаны генеральным сакратаром СНД на наступныя тры гады.

Кіраўнікі дзяржаў таксама прынялі рашэнні аб спыненні шэрагу шматбаковых дагавораў, заключаных у рамках СНД.

# ГЭТА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ БЯСПЕКІ НА ПРАСТОРЫ САДРУЖНАСЦІ»

## «ДАВАЙЦЕ БАЧЫЦЬ ПАРТНЁРАЎ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ АДЗІН У АДНЫМ»

**«Другое:** у аснове многіх, калі не ўсіх, сучасных канфліктаў ляжаць эканоміка і канкурэнцыя», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён упэўнены, што, каб выстаяць у гэтай барацьбе, забяспечыць устойлівае развіццё і павышэнне дабрабыту ўсіх нашых краін, трэба ўмацоўваць эканамічны фундамент і паглыбляць гандлёвае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва, вытворчую кааперацыю.

«Давайце не страцім тое, што напрацавана пакаленнямі нашых людзей, — заклікаў беларускі лідар. — Давайце бачыць партнёраў у першую чаргу адзін у адным, максімальна пашыраць узаемадзеянне без усялякіх закрытых тэм».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, нягледзячы на «шалёны санкцыйны націск Захаду», спробы ўбіць клін паміж краінамі СНД пагрозамі другасных санкцый, у Садружнасці сёлета захоўваюцца станоўчыя тэмпы эканамічнага росту — 2,2 % за студзень — ліпень.

Тым не менш, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, трэба нарошчваць запас трываласці эканомік. Ён нагадаў свой тэзіс аб тым, што галоўнае — гэта эканоміка. «Мы так ці інакш упіраемся ў пытанне нашай сумеснай дзейнасці ў эканоміцы ў рамках (былога. — **«Зв.»**) Савецкага Саюза, агульнага рынку, — канстатаваў ён. — Размова тут не ідзе аб вяртанні да таго парадку, які быў у Савецкім Саюзе. Але агульны рынак быў глабальны, вялізны. Можа, нам адкінуць усялякія незразумелыя развагі-разважанні і заняцца нарэшце пытаннямі эканомікі, улічваючы тое, што патрэбна кожнаму з нас?»

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што ў выпадку выпрацоўкі агульнай стратэгіі ўдасца аднавіць эканамічную прастору з улікам пажаданняў усіх дзяржаў і выбудаваць скаардынаваныя дзеянні на міжнароднай арэне ў галіне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Пры гэтым, падкрэсліў ён, ні ў якім разе не трэба закранаць амбіцыі кожнай з дзяржаў СНД. «Але гэта трэба пачынаць рабіць цяпер», — заявіў беларускі лідар.

Акрамя таго, Прэзідэнт прывітаў прыняцце на пасяджэнні дэкларацыі аб супрацоўніцтве ў сферы забеспячэння рэгіянальнай энергетычнай бяспекі. Ён таксама нагадаў, што 29 верасня ў Мінску зацверджаны план мерапрыемстваў па рэалізацыі стратэгіі эканамічнага развіцця СНД да 2030 года.

## «РОСТ ЦІКАВАСЦІ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА З НАШЫМІ АГУЛЬНЫМІ СТРУКТУРАМІ З БОКУ ТРЭЦІХ КРАІН НАБЫВАЕ ХАРАКТАР УСТОЙЛІВАЙ ТЭНДЭНЦЫІ»

**Трэцім** стратэгічным кірункам у дзейнасці Садружнасці Аляксандр Лукашэнка назваў умацаванне аўтарытэту і пазіцыянаванне СНД на міжнароднай арэне. «Актывізацыя інтэграцыйнага ўзаемадзеяння дзяржаў Еўразіі, рост цікавасці да супрацоўніцтва з нашымі агульнымі структурамі з боку трэціх краін набываюць характар устойлівай тэндэнцыі», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Беларускі лідар прапанаваў паглядзець, як у гэтым плане рушыла наперад Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, якія вынікі ёсць у ЕАЭС. «Садружнасці Незалежных Дзяржаў таксама неабходна ўмацоўваць узаемадзеянне з краінамі і арганізацыямі-аднадумцамі для прасоўвання ўзгодненага міжнароднага парадку дня, адстойвання нашых падыходаў і каштоўнасцяў», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

У сувязі з гэтым, па яго словах, агульным інтарэсам адпавядае надзяленне ШАС статусам назіральніка ў Садружнасці. Акрамя таго, Прэзідэнт Беларусі цалкам падтрымаў ініцыятыву Прэзідэнта Казахстана аб заснаванні фармату «СНД плюс».

Беларускі лідар выказаўся аб неабходнасці захавання традыцый міжкультурнай камунікацыі і гуманітарнага супрацоўніцтва — **чацвёртым** стратэгічным кірунку. Ён выказаў меркаванне, што ў бягучым годзе ўдалося годна правесці мерапрыемствы, прысвечаныя 80-годдзю Перамогі над фашызмам, у тым ліку заснаваўшы ганаровае званне СНД «Горад працоўнай славы. 1941—1945 гады». «У Беларусі цяпер яго з гонарам носяць Баранавічы і Орша», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што ў 2026 годзе споўніцца 40 гадоў з дня адной з найбуйнейшых тэхнагенных катастроф у гісторыі чалавецтва — аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што гэтай тэме прысвечаны заява ў рамках СНД, а таксама прапанаваная на 80-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН рэзалюцыя па тэме Чарнобыля.

На заканчэнне кіраўнік дзяржавы заявіў, што Беларусь высока ацэньвае старшынства Таджыкістана ў органах СНД у 2025 годзе. Карыстаючыся выпадкам, Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць Прэзідэнту Таджыкістана Эмамалі Рахмону за гасціннасць, а Выканкаму СНД — за высокі ўзровень падрыхтоўкі сёлетніх мерапрыемстваў.

Беларускі лідар павіншаваў Прэзідэнта Туркменістана з прыняццем Ашхабадам старшынства ў СНД. Аляксандр Лукашэнка запэўніў Сердара Бердымухамедава, што Туркменістан можа разлічваць на сядзейнічанне Беларусі.

## На палях саміту СНД Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні журналістаў

**Прадстаўнікі расійскіх СМІ пацікавіліся ў беларускага лідара падрабязнасцямі закрытай размовы лідараў СНД (пасля мерапрыемстваў саміту яны гадзіну размаўлялі за зачыненнымі дзвярыма), у прыватнасці, аб словах Уладзіміра Пуціна.**

«Ён падрабязна праінфармаваў у тым ліку і аб Алясцы, аб дамоўленасцях, сітуацыі да Аляскі, аб сітуацыі пасля Аляскі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Журналісты ўдакладнілі, ці ёсць новая інфармацыя, якой Аляксандр Лукашэнка можа падзяліцца.

«Напэўна, вы ўсё ведаеце, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Наколькі я праінфармаваны, размова ішла аб прапановах саміх Злучаных Штатаў Амерыкі ў свой час, і Пуцін гэта пацвердзіў. Аб прапановах аб Украіне. ЗША, а не Расіі».

**Прадстаўнікі медыя спыталі, ці актуальныя яшчэ гэтыя прапановы.**

«Яно заўсёды будзе актуальна, — падкрэсліў беларускі лідар. — Калі б гэта было прынята сёння, сёння спынілася б вайна. Калі заўтра — заўтра».

У Аляксандра Лукашэнкі пацікавіліся, ці згодны ён з рашэннем Нобелеўскага камітэта аб прысуджэнні Нобелеўскай прэміі міру апазіцыйнаму палітыку з Венесуэлы. «Глупства поўнае, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Трамп заслужыў гэту Нобелеўскую прэмію, і яму трэба было аддаваць. Па ўсіх прычынах. Асабліва па тых прычынах, па якіх апошнім часам Нобелеўская прэмія прысуджалася ўвогуле абы-каму. Вы згадайце справы мінулыя, Прэзідэнту ЗША (Барак Абама. — **«Зв.»**), які ўвогуле нічога не зрабіў: стаў Прэзідэнтам — атрымаў гэту прэмію. А Трамп нямала зрабіў для міру. Яны вельмі дрэнную паслугу аказалі самому мірнаму працэсу ва ўсіх пунктах. Трамп можа пакрыўдзіцца».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што Нобелеўскі камітэт прысудзіў прэмію не міру, а тым, хто не зацікаўлены ў міры. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы дадаў, што ён нічога не мае супраць лаўрэата з Венесуэлы, ён яе не ведае.

«Абсалютна перакананы, што з усіх пазіцый, і асабліва на перспектыву, каб Трампа прывязаць гэтай Нобелеўскай прэміяй да мірнага працэсу, трэба было даваць яму гэту прэмію, — лічыць беларускі лідар. — Блізарукае рашэнне, увогуле не зразумела якое. Гэта так, экспромтам. Падумаем».

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

**Фота БелТА.**

## Падрабязнасці міжнародных кантактаў на палях саміту СНД



Адказваючы на пытанні журналіста тэлеканала «Першы інфармацыйны», **прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ** раскрыла некаторыя падрабязнасці міжнародных кантактаў Аляксандра Лукашэнкі на палях саміту СНД у Таджыкістане.

Напярэдадні асноўнага дня саміту ў Душанбэ адбылася нефармальная вячэра лідараў краін СНД, якая праходзіла ў закрытым фармаце. «Пакуль нейкіх канкрэтных падрабязнасцяў я вам не раскажу: на тое яна і кулуарная частка, закрытая частка», — заўважыла прэс-сакратар у адказ на просьбу прыадкрыць дэталі праведзеных перагавораў. Яна патлумачыла, што на такіх мерапрыемствах прэзідэнты размаўляюць адзін з адным тэт-а-тэт, але ў шырокім складзе.

«Размаўлялі доўга, вельмі даверліва і з вельмі добрым настроем. Вось гэта я ведаю дакладна», — удакладніла прэс-сакратар.

Размовы лідараў працягнуліся непасрэдна ў асноўны дзень саміту. Да яго пачатку адбылася размова прэзідэнтаў Беларусі і Таджыкістана Аляксандра Лукашэнкі і Эмамалі Рахмона. «Наш Прэзідэнт і Прэзідэнт Таджыкістана абмеркавалі ўвесь комплекс асноўных беларуска-таджыкскіх адносін, пытанняў, якія ў нас ёсць», — адзначыла Наталля Эйсмант.

На палях саміту СНД Аляксандр Лукашэнка размаўляў і з усімі астатнімі прэзідэнтамі, з прэм'ер-міністрам Арменіі. «Як звычайна бывае на буйных міжнародных пляцоўках, усе выкарыстоўваюць гэты час для таго, каб паміж сабой паразмаўляць і канструктыўна паўзаемадзейнічаць», — патлумачыла прэс-сакратар.

Наталля Эйсмант таксама паведаміла аб тым, што Аляксандр Лукашэнка возьме ўдзел у нефармальнай сустрэчы лідараў краін СНД у канцы снежня. Яна традыцыйна праходзіць у Санкт-Пецярбургу, і на пасяджэнні ў Душанбэ Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін запрасіў на яе сваіх калег па Садружнасці.



11 кастрычніка 2025 г. ЗВЯЗДА

# «АБСАЛЮТНЫ ПРЫЯРЫТЭТ — ГЭТА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ БЯСПЕКІ І ЗАХАВАННЕ МІРУ НА ПРАСТОРЫ САДРУЖНАСЦІ»

## Гаворацць удзельнікі

### Уладзімір ПУЦІН, Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі:



«Дзверы Садружнасці адкрытыя для ўсіх. На мой погляд, гэта выгадна — эканамічныя выгоды дае, большыя рынкі адкрывае, стварае лепшыя ўмовы для кааперацыі. У рэшце рэшт гэта проста карысна. У рамках СНД ідуць працэсы імпартазамяшчэння. Мяркую, гэта важна і для ўсіх нас: важна не замясціць штосьці, а быць лідарамі дзесьці, і не проста дзесьці, на нейкай перыферыі развіцця, а па ключавых кірунках. Нашымі краінамі выбудоўваецца ўстойлівая і незалежная ад знешняга ўплыву фінансавая інфраструктура. Практычна ўсе ўзаемаразлікі цяпер выконваюцца ў нацыянальных валютах. Іх доля ў камерцыйных аперацыях паміж удзельнікамі СНД у першым паўгоддзі 2025 года склала 96 %. Гэта не значыць, што краіны адмаўляюцца ад выкарыстання іншых плацежных інструментаў і валют. Гэта павышае нашы незалежнасць і суверэнітэт. Гэта рэч відавочная, у сучасным свеце асабліва. Гэта дае магчымасць незалежна ад міжнароднай кан'юнктуры пашыраць таварныя абмены, ажыццяўляць сустрэчныя інвестыцыі, развіваць уласны рынак капіталу. Самае галоўнае заключаецца ў тым, што нам удалося захаваць такую пляцоўку не проста для адносін, а стварыць і агульны рынак, і агульную гуманітарную прастору ў вядомай ступені захаваць».

### Эмамалі РАХМОН, Прэзідэнт Таджыкістана:



«Таджыкістан у год свайго старшынства ў СНД у цесным супрацоўніцтве з дзяржавамі-ўдзельніцамі і Выканаўчым камітэтам працягнуў комплексную работу па рэалізацыі намечаных мэт. Прыярытэтная ўвага была ўдзелена працэсу ўдасканалення дзейнасці арганізацыі, пры гэтым прадоўжана работа па пашырэнні гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, развіцця транспартна-лагістычных узаемазвязанасці і лічбавай інтэграцыі. У полі зроку пастаянна знаходзіліся пытанні ўмацавання бяспекі. Актыўна рухалася гуманітарнае вымярэнне.

Заўсёды рады прымаць у нашай краіне сяброў і партнёраў, з якімі нас аб'ядноўваюць агульныя інтарэсы і імкненні ў развіцці супрацоўніцтва».

### Сердар БЕРДЫМУХАМЕДАЎ, Прэзідэнт Туркменістана:



«СНД павінна і ў далейшым служыць важным інструментам супрацоўніцтва, заснаванага на добрай волі ўдзельнікаў, раўнапраўі і ўзаемапавазе, суаднясенні з нацыянальнымі інтарэсамі кожнай краіны. Менавіта гэта забяспечвала і будзе ў далейшым забяспечваць Садружнасці Незалежных Дзяржаў жыццяздольнасць і гнуткасць, раскрываць новыя грані і перспектывы партнёрства, абумоўліваць існаванне СНД у якасці аднаго з фактараў устойлівасці сістэмы міжнароднай стабільнасці і бяспекі. Прынятае рашэнне аб старшынстве Ашхабада ў СНД у 2026 годзе туркменскі бок разглядае як сведчанне павагі і даверу з боку ўсіх дзяржаў — удзельніц Садружнасці. Туркменістан з усёй адказнасцю падыдзе да старшынства, у поўнай меры ўсведамляе маштаб і ўзровень задач, якія трэба будзе вырашаць. Сваёй мэтай на перыяд старшынства мы бачым усялякае садзейнічанне ўмацаванню супрацоўніцтва і партнёрскага ўзаемадзеяння дзяржаў-удзельніц для максімальнай рэалізацыі патэнцыялу СНД, эфектыўнага развіцця дзяржаў Садружнасці, росту дабрабыту і якасці жыцця народаў нашых краін. СНД з'яўляецца адным з фактараў устойлівасці міжнароднай сістэмы бяспекі».

### Касым-Жамарт ТАКАЕЎ, Прэзідэнт Казахстана:



«Для поўнага раскрыцця транспартнага патэнцыялу ўсіх нашых краін перад намі стаіць задача стварэння сучаснай інфраструктуры. Прапаную разгледзець магчымасць падрыхтоўкі адзінай лічбавай транспартна-лагістычнай карты Садружнасці. Яна дасць магчымасць аб'яднаць нацыянальныя інфраструктурныя планы і стварыць цэласную прастору транспартнай узаемазвязанасці, што забяспечыць умовы для прыцягнення вялікага аб'ёму інвестыцый. Блізкая да завяршэння падрыхтоўка канцэпцыі спалучэння галоўных транспартных артэрый, якія праходзяць па тэрыторыях дзяржаў СНД. Для эфектыўнага кіравання грузапатокамі, зніжэння выдаткаў і мінімізацыі рызык трэба было б дапоўніць гэты дакумент палажэннямі, якія прадугледжваюць укараненне тэхналогій штучнага інтэлекту. Прадуктыўнае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва магчыма толькі пры наяўнасці транспартных калідораў, якія актыўна функцыянуюць. Шырокі рэгіён СНД традыцыйна выступае сувязным звяном паміж Еўропай і Азіяй, адыгрываючы асаблівую ролю ў глабальнай транспартна-лагістычнай сістэме. Казахстан гатовы дапамагчы членам СНД у падрыхтоўцы спецыялістаў па рабоце са штучным інтэлектам, здольных працаваць ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі на глабальным рынку.

### Шаўкат МІРЗІЁЕЎ, Прэзідэнт Узбекістана:



«Дзякуючы наладжаным за дзесяцігоддзі механізмам і кантактам вядзецца цесная сумесная работа па ўсім спектры эканамічных, сацыяльных і гуманітарных пытанняў. Мы зацікаўлены ў далейшым умацаванні супрацоўніцтва ў рамках СНД, а таксама павышэнні рэзультатыўнасці практычнага ўзаемадзеяння з краінамі, якія з'яўляюцца нашымі сапраўднымі партнёрамі. Безумоўным прыярытэтам з'яўляецца нарошчванне эканамічнага партнёрства з улікам сітуацыі, якая пагаршаецца ў сусветнай эканоміцы, узмацнення пратэкцыянізму і з'яўлення новых выклікаў устойліваму развіццю. У мэтах захавання набраных тэмпаў і дынамікі супрацоўніцтва ў рамках СНД варта засяродзіць сумесныя намаганні ў такіх кірунках, як нарошчванне тавараабароту, паглыбленне ўзаемадзеяння ў галіне транспарту, стымуляванне росту ўзаемных інвестыцый, развіццё супрацоўніцтва ў сферах лічбавізацыі і энергетыкі. Важна пашыраць сумесныя праекты і праграмы ў сферы навукі, адукацыі, культуры і мастацтва, працягваць сістэмныя, цесныя кантакты па лініі знешнепалітычных ведамстваў і спецслужбаў».




Наименование банка:

ОАО «НКФО «ЕРИП»

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**30 сентября 2025 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2025 | 01.01.2025 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | - | - |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 8 284 | 3 350 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 87 159 | 80 311 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 7 001 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | - | - |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 893 | 864 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 11 741 | 7 943 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 4 774 | 5 502 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 119 852 | 97 970 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | - | - |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 8 254 | 3 053 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 3 599 | 3 006 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 11 853 | 6 059 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 74 459 | 57 945 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 4 507 | 3 356 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | (113) | - |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 29 146 | 30 610 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 107 999 | 91 911 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 119 852 | 97 970 |

**ОТЧЕТ**
**о прибылях и убытках**
**за январь – сентябрь 2025 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2025 | 30.09.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 9 144 | 5 408 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | - | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 9 144 | 5 408 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 37 084 | 31 339 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 8 | 8 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 37 076 | 31 331 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (1) | (1) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 34 | 73 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 3 766 | 2 958 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 20 783 | 16 673 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 358 | 357 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 28 810 | 22 593 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 7 696 | 5 934 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 21 114 | 16 659 |

Председатель Правления

Главный бухгалтер

Дата подписания: 06 октября 2025 г.

УНП 807000268

КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ

# З АКЦЭНТАМ НА ЭКАНАМІЧНЫ СКЛАДНІК

## У Савеце Рэспублікі абмеркавалі пытанні саюзнага парадку дня

**На сустрэчы з Дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Сяргеем ГЛАЗЬЕВЫМ Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА звярнула ўвагу, што Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі — унікальнае інтэграцыйнае аб'яднанне, якое можа служыць прыкладам для іншых.**



«Фундаментам такога шчыльнага супрацоўніцтва з'яўляюцца добрыя сяброўскія адносіны, якія склаліся паміж нашымі лідарамі, — падкрэсліла спікер. — Тыя задачы, якія ставяць нашы лідары, павінны рэалізоўвацца на карысць нашых народаў і краін. Тое, што мы сёння бачым у эканамічным супрацоўніцтве, не можа нас не радаваць. Тавараабарот за мінулы год склаў звыш 50 мільярдаў долараў. За першае паўгоддзе дынаміка захоўваецца».

Старшыня Савета Рэспублікі канстатавала, што ў абедзвюх краінах створаны прадпрыемствы, што выпускаюць сумесную прадукцыю добрай якасці. «Гэтаму садзейнічаюць і тыя праграмы, якія рэалізуюцца ў рамках Саюзнай дзяржавы, — удакладніла спікер. — Мы, парламентарыі, разумеем, што павінны больш шчыльна працаваць у нашых інтэграцыйных працэсах».

Найперш маецца на ўвазе рэгіянальнае супрацоўніцтва. І яно вельмі паспяховае, што ў чарговы раз пацвердзіў XII Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які прайшоў у Ніжнім Ноўгарадзе. У рамках форуму было заключана кантрактаў на 900 мільёнаў беларускіх рублёў.

«Рэгіянальнае супрацоўніцтва — гэта важны аспект у нашай рабоце. Мы як палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва ў гэтым зацікаўлены», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі праанансавала, што XIII Форум рэгіёнаў пройдзе ў 2026 годзе ў Мінску і Мінскай вобласці. Па яе словах, на наступным форуме больш увагі будзе ўдзелена эканамічнаму складніку.

У грамадзян Саюзнай дзяржавы павінны быць роўныя правы. У якасці прыкладу Наталля Качанава прывяла нядаўнюю ратыфікацыю Пратакола аб унясенні змяненняў у Дагавор паміж Беларуссю і Расіяй аб роўных правах грамадзян. Грамадзяне Беларусі і Расіі, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі саюзнай дзяржавы, цяпер змогуць удзельнічаць у мясцовых выбарах: выбіраць і быць выбранымі ў адпаведныя органы мясцовага самакіравання.

«Вы заўсёды можаце разлічваць на нас, парламентарыяў, у прасоўванні тых пытанняў і задач, якія пастаўлены кіраўнікамі дзяржаў, якія мы павінны вырашаць у рамках сваіх паўнамоцтваў», — рэзюмавала спікер.

У размове з журналістамі Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Сяргей Глазьеў адзначыў, што на сустрэчы ў Савеце Рэспублікі абмяркоўвалася шырокае кола пытанняў, звязанае з далейшым функцыянаваннем Саюзнай дзяржавы ў рамках тых прыярытэтных кірункаў, якія вызначаны лідарамі дзяржаў.

Вельмі важным кірункам работы ў рамках інтэграцыйнага аб'яднання Сяргей Глазьеў лічыць развіццё навукова-тэхнічных праграм. «Беларуссю дасягнуты цудоўныя вынікі ў сферы практычнага прымянення шэрага праграм Саюзнай дзяржавы, практычна ўсе яны знайшлі ўвасабленне, — канкрэтызаваў ён. — Асабліва важна падкрэсліць рэалізацыю праграм у галіне аховы здароўя. У прыватнасці, рэалізавана праграма «ДНК-ідэнтыфікацыя», якая дазваляе ў Беларусі разгарнуць шырокі спектр паслуг па дыягностыцы генетычна абумоўленых хвароб. Ужо тысячы пацыентаў атрымліваюць дапамогу».

Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы адзначыў, што падчас сустрэчы са спікерам абмяркоўвалася і тэма рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых на апошнім Форуме рэгіёнаў, які прайшоў у Ніжнім Ноўгарадзе.

Па словах Сяргея Глазьева, неўзабаве будуць урэгуляваны пэўныя цяжкасці, з якімі сутыкнуліся беларусы, якія пражываюць у Расіі, пры перарэгістрацыі сім-карт. «У Расіі была ўведзена працэдура, звязаная з патрабаваннямі бяспекі: да 1 ліпеня неабходна было прайсці перарэгістрацыю, — удакладніў дзяржсакратар. — Гэта датычылася і расійскіх грамадзян, і беларускіх. Расіяне гэта маглі зрабіць дыстанцыйна, праз партал «Дзяржпаслугі». У беларускіх грамадзян у Расіі да гэтай сістэмы прамога доступу не было. Таму ўзнікла праблема чэргаў».

Цяпер, па яго словах, дзякуючы намаганням улад Масквы і Санкт-Пецярбурга, усе МФЦ (шматфункцыянальныя цэнтры аказання дзяржаўных і муніцыпальных паслуг) адкрываюцца для прыёму заяў ад беларускіх грамадзян, якія змогуць перарэгістраваць свае сім-карты.

«Але мы хочам пайсці яшчэ далей: задзейнічаць два партала дзяржпаслуг («Е-паслугу» Беларусі і «Дзяржпаслугі» Расіі), каб гэтыя інфармацыйныя сістэмы маглі аператыўна абменьвацца звесткамі для пацвярджэння іх дакладнасці. Тады, не выязджаючы ў Беларусі, можна прайсці перарэгістрацыю на «Дзяржпаслугах». Спадзяёмся, што мы гэтыя праблемы хутка вырашым», — падкрэсліў Сяргей Глазьеў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

# АБ ТЭХНАЛОГІЯХ І ПРА ДУШУ...

## Міністр інфармацыі — пра ўплыў штучнага інтэлекту на журналістыку

**У рамках праекта #наПадумаць міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ адказаў на пытанне падпісчыкаў пра ўплыў штучнага інтэлекту на інфармацыйную сферу.**



У прыватнасці, у міністра пацікавіліся яго меркаваннем адносна таго, ці зменяць тэхналогіі ШІ журналістыку як сферу дзейнасці або эмацыянальна-пачуццёвая сіла слова ўласцівая толькі чалавеку?

І вось што адказаў міністр інфармацыі:

— Ужо змянілі. І вы глядзіце ў корань праблемы.

Згенерыраваныя штучным інтэлектам вядучыя навін і забаўляльных праектаў, пераклады ў рэжыме анлайн і падборка навін, графічныя ўпакоўкі і найпрыгажэйшыя ролікі. Усё гэта ўжо ёсць. І ўсё гэта часцяком заснавана на душы, на эмпатыі і індывідуальнай харызме аўтара-чалавека. Штучны інтэлект можа замяніць у журналістыцы што заўгодна... акрамя той самай эмацыянальнай пачуццёвасці.

Але, каб не быць галаслоўным, я вырашыў спытаць, уласна, у самога штучнага інтэлекту. Абраў дзве найбольш папулярныя платформы, і вось іх адказы.

Deep seek:

— Безумоўна, ШІ ўжо мяняе журналістыку, аўтаматызуючы руціну: навінавыя зводкі, справаздачы, простыя шаблонныя тэксты. Гэта непазбежна і павысіць хуткасць і маштаб. Аднак эмацыянальна-пачуццёвая сіла слова, давер і аўтарскі стыль — гэта тое, што застаецца за чалавекам. ШІ можа аналізаваць шаблоны і генерыраваць дакладны тэкст, але ў яго няма асабістага вопыту, сумлення і той самай «душы», якая прымушае чытача суперажываць.

Вынік: ШІ стане магутным інструментам у руках журналіста, але не заменіць сэрца і розум чалавека, які задае нязручныя пытанні і ўкладвае ў словы сэнс.

Chat GPT:

— Хоць ШІ ўжо генерыруе тэкст, якасць і дакладнасць інфармацыі застаецца пад кантролем чалавека, які прыўносіць эмацыянальную глыбіню. Эмацыянальная сувязь і здольнасць суперажываць застаюцца ўнікальнымі рысамі журналістыкі, якія немагчыма замяніць тэхналогіямі.

У выніку ШІ стане магутным інструментам для журналістаў, але чалавечы вопыт і інтуіцыя застануцца ключавымі для стварэння якаснага кантэнту.

Міністр падсумаваў, што маем у сухім астатку:

— Зыходзячы са свайго досведу, я бачу, што ўласнага генія журналістыкі ШІ пакуль не нарадзіў. І галоўнае — штучны інтэлект не страшны, калі вы не дазваляеце яму замяніць уласны. І гэта #наПадумаць.


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2. УНП 200100328 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**
Адрес: г. Лида, ул. Мопровская, 4

| № лота | Наименование | Инвен. № | Начальная цена лота с НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Станок по облицов. поверхн. FRIZ RU 15/30 | 00000132 | 10 758,78 |
| 2 | Станок для оклейки кромок HOMAG OPTIMAT | 00000172 | 15 940,90 |
| 3 | Линия обрезки мебельных щитов HOMAG FPL | 00000175 | 22 136,91 |
| 4 | Станок для искусственного старения | 00000286 | 8 393,03 |
| 5 | Станок форматно-обрезной «Альтендорф» | 042425 | 4 337,46 |
| 6 | Обрабат. центр С ЧПУ ROVER S 1/30K3-BIESSE | 042496 | 21 798,95 |
| 7 | Станок для попереч. раскроя и оптимизации DIMTER | 042522 | 31 036,64 |
| 8 | Линия сращивания по длине GRECON PROFIJOINT | 042523 | 16 954,79 |
| 9 | Станок четырехстор. продольно-фрез. VARIOMAT | 042524 | 30 360,72 |
| 10 | Шлиф. станок BUTFERING OPTIMAT SWO 313 R | 042525 | 15 152,32 |
| 11 | Универ. заточной станок RS 2000 | 042535 | 4 112,15 |
| 12 | Полуавтомат. токарно-копир. станок с функцией фрезеровки | 042617 | 8 280,37 |
| 13 | Автомат. кромкообл. станок мод. OLIMPIC K400E | 042641 | 5 238,69 |
| 14 | Универсал. шипорезный станок | 042642 | 7 829,75 |
| 15 | Универс. пазов. станок с двумя рабочими столами | 042643 | 3 323,56 |
| 16 | Универс. фрезерно-свер. обрабатыв.центр с ЧПУ | 042644 | 21 348,33 |
| 17 | Полуавтоматич. шипорезный станок PADE TF с двумя столами | 042665 | 7 829,75 |
| 18 | Строгальный станок Weinig Unimat U17N б/у | 042696 | 8 956,30 |
| 19 | Станок «Софтформинг-Оптимат» К-79/Е12/53 | 00000546 | 6 139,93 |
| 20 | Обрабат. центр с ЧПУ ROVER B 7.40 R FT, BIESSE | 10037 | 35 768,15 |
| 21 | Станок калибровально-шлиф. мод.S219R/KRT | 10067 | 16 166,21 |
| 22 | Одностор. кромкооблиц. станок для нанесения и обработки плоской кромки в рулонах (меламин, ПВХ, ABS, шпон) и в полосах массив дерева, пластик и т. п.) мод. STREAM A/5.0 - BIESSEEEDGE | 2474 | 43 428,67 |
| 23 | Универсально-заточ. станок 3Д642Е (кл. т. П) | 042283 | 2 309,67 |

Цена снижена на 70 %.
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере от 1 % до 10 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.09.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 23.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие принимаются по 22.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**



**Могилевский филиал**
**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества, принадлежащего**
**ОАО «Бобруйский завод КПД»**
**на праве собственности**

**Аукцион состоится 27.10.2025 в 11.00**
**по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**

Лот № 1

**Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 710/U-77090,** пл. – 1 423,2 кв. м, назначение: Здание неустановленного назначения.

Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000002002357 (пл. – 0,2551 га, право аренды) по адресу: г. Бобруйск, ул. Днепровской флотилии, 1А.

**Начальная цена продажи: 97 200,00 бел. руб.**
**Сумма задатка: 9 720,00 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 24.10.2025 до 11.00. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

Продавец: ОАО «Бобруйский завод КПД», УНП 700016179, г. Бобруйск, ул. Минская, 130, 8-0225-732330.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности**
**ОАО «МПОВТ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 600/С-156718, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 16. Площадь: 964,7 кв. м. Наименование: Склад для хранения химических и других материалов. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное кирпичное здание склада для хранения химических и других материалов с четырьмя навесами 1, 2, 3, 4. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-149365, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/2, район аг. Колодищи. Площадь: 548,6 кв. м. Наименование: Склад металлоизделий с участком комплектации. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное металлическое здание склада металлоизделий с участком комплектации. Обременение: аренда.<br>Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **885 000,00** | **Задаток, BYN** | **88 500,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 600/С-159127, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/6, район аг. Колодищи. Площадь: 1672,3 кв. м. Наименование: Склад № 17 ВУ (инв. № 29759). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное кирпичное здание склада № 17 ВУ (инв. № 29759) А1/к. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **970 000,00** | **Задаток, BYN** | **97 000,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ»<br>Республика Беларусь,<br>220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62.<br>Тел. +375 (17) 388 90 99.<br>E-mail: mpovt@mpovt.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг»<br>220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1.<br>Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами – в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 30 октября 2025 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **31 октября 2025 года** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»:<br>**По Лоту № 1 в 11.00;**<br>**По Лоту № 2 в 15.00** | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона | | | | | |



# ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

## Урад зацвердзіў пералік дзяржпраграм навуковых даследаванняў на 2026–2030 гады

Адпаведную пастанову падпісаў Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

У пералік уключана 12 праграм па ключавых кірунках сучаснай навукі, у ліку якіх «Энергафізічныя сістэмы і тэхналогіі» («Энергафізіка-2030»); «Хімічныя працэсы і тэхналогіі», «Геномныя, малекулярныя і клеткавыя тэхналогіі»; «Інтэлектуальныя, інфармацыйныя і касмічныя тэхналогіі, бяспека чалавека, грамадства і дзяржавы»; «Фатоніка і мікраэлектроніка»; «Механіка, машынабудаванне, рабатызаваныя, беспілотныя і інтэлектуальныя сістэмы»; «Сучаснае матэрыялазнаўства, перспектыўныя матэрыялы і новыя тэхналогіі»; «Рацыянальнае прыродакарыстанне»; «Міждысцыплінарныя і сінергетычныя даследаванні» («Канвергенцыя-2030»); «Інавацыі ў АПК»; «Эксперыментальная медыцына і медыцынскія біятэхналогіі» і «Сацыяльна-эканамічная, палітычная і нацыянальна-культурная бяспека беларускай дзяржаўнасці».

Для кожнай праграмы вызначаны асноўныя мэты, дзяржаўныя заказчыкі, галаўныя арганізацыі-выканаўцы, аб'ёмы фінансавання.

Як удакладнілі ва ўрадзе, усяго на выкананне праграм у 2026–2030 гадах плануецца накіраваць сродкі рэспубліканскага бюджэту ў аб'ёме 1 мільярд 577,5 мільёна рублёў.

# ЭЛЕКТРОННЫ ГАНДАЛЬ І ПРАВЫ СПАЖЫЎЦОЎ

## Новыя выклікі і абарона пакупніка ў эпоху маркетплэйсаў

У апошнія гады рынак інтэрнэт-гандлю ў Беларусі і ў свеце перажывае сапраўдны выбух. Маркетплэйсы, якія яшчэ нядаўна ўспрымаліся як дадатковы канал продажаў, сёння ператвараюцца ў галоўную пляцоўку для мільёнаў пакупнікоў. Але разам з выгадай ды шырокім выбарам тавараў спажыўцы сутыкаюцца і з шэрагам праблем. Пра гэта расказала прэс-сакратар «Рэгіянальнага таварыства абароны спажыўцоў», юрысконсульт Анастасія РУДАК.

### «МЫ АТРЫМЛІВАЕМ УСЁ БОЛЬШ ЗВАРОТАЎ»

Па словах суразмоўцы, рост анлайн-гандлю прывёў да значнага павелічэння колькасці зваротаў ад грамадзян. Пакупнікі прызвычаіліся рабіць заказы з дому, карыстаючыся мабільнымі дадаткамі і віртуальнымі кошыкамі. Але разам са зручнасцю ўзнікаюць і новыя рызыкі.

**НАЙБОЛЬШ РАСПАЎСЮДЖАНЫЯ СКАРГІ ТЫЧАЦЦА:**
- набыцця няякаснага тавару, які складана вярнуць;
- адмовы прадаўца прымаць тавар у прадугледжаныя законам тэрміны;
- парушэнняў тэрмінаў пастаўкі ўжо аплачаных пакупак;
- адмовы ў кампенсацыі маральнай шкоды, хаця закон дае такое права.

«Часта сустракаемся з сітуацыямі, калі прадавец гатовы вярнуць грошы за тавар, але катэгарычна адмаўляецца аплачваць маральную шкоду. Гэта прымушае спажыўцоў звяртацца ў суд», — падкрэсліла прадстаўнік Таварыства.

Калі ў звычайных крамах пакупнік можа непасрэдна звярнуцца да адміністрацыі і паспрабаваць вырашыць усе прэтэнзіі нават вусна, то ў інтэрнэт-гандлі ўсё больш складана. Нярэдка адзіным «суразмоўцам» становіцца чат-бот. «На прасторах інтэрнэт-пляцовак рэалізуе тавары мноства прадаўцоў. Некаторыя з іх зарэгістраваны за межамі нашай краіны. У такіх выпадках спажыўцы губляюцца і задаюцца пытаннем: як звярнуцца да прадаўца? Зварот да чат-бота юрыдычна не лічыцца паўнавартаснай прэтэнзіяй. Мы рэкамендуем скіроўваць у пісьмовай форме на юрыдычны адрас прадстаўніка прадаўца ў Беларусі», — адзначыла эксперт.

### ЗАКАНАДАЎЧЫЯ ЗМЕНЫ: ШТО НОВАГА?

11 ліпеня былі прынятыя істотныя папраўкі ў Закон аб абароне правоў спажыўцоў у сферы інтэрнэт-гандлю. Адно з галоўных новаўвядзенняў — абавязак маркетплэйсаў забяспечваць тэхнічную магчымасць для электронных зваротаў.

«Цяпер на гандлёвых пляцоўках павінна быць форма, праз якую спажывец можа пакінуць сваю прэтэнзію. Пакуль не зразумела, як гэта будзе працаваць на практыцы, бо колькасць зваротаў можа быць вельмі вялікая. Але сама ідэя важная і неабходная», растлумачыла Анастасія Рудак. Законам таксама ўстаноўлены канкрэтныя тэрміны: вяртанне грошай — да 7 дзён, рамонт — да 14 дзён. За парушэнне гэтых нормаў прадугледжаны штрафныя санкцыі.

Нягледзячы на магчымасць дасудовага ўрэгулявання, шмат спраў усё ж трапляюць у суд. Як паказвае практыка, нярэдка прадаўцы пачынаюць вырашаць пытанне толькі пасля атрымання павесткі. «Сітуацыя вельмі неадназначная: адны прадаўцы рэагуюць хутка, іншыя — толькі пад пагрозай судовай справы», — адзначыла юрыст.

Акрамя таго, на сайце маркетплэйса трэба размяшчаць правілы прадастаўлення паслуг і ў іх раскрываць інфармацыю аб размеркаванні абавязкаў і адказнасці паміж уладальнікам інтэрнэт-пляцоўкі і прадаўцом, які прапануе да продажу тавары.

### КАНКРЭТНЫЯ ГІСТОРЫІ І ШЛЯХІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ

Таварыства сутыкалася з рознымі цікавымі выпадкамі. Напрыклад:

— інструкцыя да тавару складзена на кітайскай мове без перакладу — гэта парушэнне закона;

— спажывец заказаў тавар аднаго колеру, а атрымаў — другога;

— найбольш яскравы выпадак — з «адбельвальнікам для красовак», які цалкам сапсаваў абутак. Пасля экспертызы суд прызнаў парушэнне і абавязаў прадаўца вярнуць грошы, кампенсаваць маральную шкоду і аплаціць экспертызу.



На думку Анастасіі Рудак, найбольш вострая праблема — адсутнасць хуткай і якаснай камунікацыі з боку прадаўцоў. «Асноўныя цяжкасці пачынаюцца не з няякаснага тавару, а з таго, што прадавец ігнаруе пакупніка. Часта замест рэальнага дыялогу людзі атрымліваюць фразы ад робатаў кшталту: «Ваша заяўка разглядаецца, мы Вас цэнім, супакойцеся і пачакайце трошкі». Гэта раздражняе яшчэ больш. Вельмі важна, каб спажыўцам адказвалі жывыя людзі, каб у іх быў дакладны зварот і разуменне таго, ці будзе задаволена іх патрабаванне», — падкрэсліла прэс-сакратар «Рэгіянальнага аб'яднання абароны спажыўцоў».

Такім чынам, развіццё інтэрнэт-гандлю патрабуе не толькі тэхнічнага ўдасканалення, але і ўважлівага стаўлення да правоў пакупнікоў. Бо менавіта яны ствараюць аснову даверу і будучыні ўсёй сферы.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# ПАВЫСІЦЬ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

## Мінпрам: для ўмацавання пазіцый на рынку прадпрыемствам неабходна працягваць мадэрнізацыю і ўкараняць новыя тэхналогіі

Міністр прамысловасці Беларусі Андрэй КУЗНЯЦОЎ пабываў з рабочай паездкай у Гродзенскай вобласці, дзе наведаў шэраг прадпрыемстваў галіны. Разам з профільным міністрам удзел у наведванні прадпрыемстваў прыняў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Юрый КАРАЕЎ.

Так, на «Кіруючай кампаніі холдынга «Лідсельмаш», якая з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам сельгастэхнікі, зернесушыльных комплексаў і стальных панэльных радыятараў, была праінспектавана праца асноўных вытворчых цэхаў і ўчасткаў. Асаблівая ўвага — абмеркаванню шэрагу праблемных пытанняў у дзейнасці арганізацыі. Па выніках пастаўлены задачы і дадзены канкрэтныя даручэнні па далейшай мадэрнізацыі вытворчасці і ўдасканаленні работы арганізацый, якія ўваходзяць у холдынг.

На пляцоўцы ААТ «Ваўкавыскі машынабудаўнічы завод» профільны міністр і губернатар вобласці ацанілі перспектывы і магчымасці прадпрыемства па павышэнні эфектыўнасці работы. Дарэчы, завод спецыялізуецца на выпуску будаўнічага і сельскагаспадарчага абсталявання, іншых відаў вырабаў.

Удзельнікі наведвання абмеркавалі вялікі спектр пытанняў, у тым ліку павышэння эфектыўнасці вытворчай і камерцыйнай дзейнасці, абнаўлення вытворчага абсталявання, пашырэння кліенцкай базы.

У ААТ «ВолМет» (прадпрыемстве холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ») у ліку тэм, якія абмяркоўваліся, — стратэгічныя кірункі развіцця, уключаючы ўкараненне сучасных тэхналогій для павышэння вытворчай эфектыўнасці.

Ацэнка бягучага стану прадпрыемства, вывучэнне перспектыў далейшага развіцця сталі галоўнымі мэтамі наведвання ААТ «Белкард» (холдынг «БАТЭ»). Завод выпрабляе карданныя валы і перадачы, амартызатары (амаль 1,3 тысячы відаў вырабаў) і пастаўляе іх на зборачныя канвееры аўтамабільных заводаў.

Андрэй Кузняцоў звярнуў увагу на ўдасканаленне якасці вытворчых працэсаў, укараненне новых тэхналогій.

— Наведванне прадпрыемстваў сістэмы Мінпрама ў Гродзенскай вобласці пацвердзіла іх важную ролю ў развіцці мясцовай прамысловасці і эканомікі краіны ў цэлым. Мы бачым унёсак гэтых прадпрыемстваў у стварэнне працоўных месцаў, павышэнне прадукцыйнасці і развіццё тэхналогій, — адзначыў профільны міністр.

Аднак для дасягнення новага ўзроўню росту і ўмацавання пазіцый на рынку, на яго думку, неабходна працягваць інвеставаць у мадэрнізацыю вытворчасці, укараненне сучасных тэхналогій і развіццё кадравага патэнцыялу.

— Толькі сумеснымі намаганнямі мы зможам забяспечыць далейшы прагрэс прадпрыемстваў Мінпрама і ўмацаваць іх ролю ў прамысловым сектары краіны, — рэзюмаваў Андрэй Кузняцоў.



# ПРАПАНОВА ДЛЯ ПАДНЯБЕСНАЙ

## БУТБ расказала экспарцёрам, як выйсці на рынак Кітая



Кітай з'яўляецца адным з асноўных партнёраў Беларусі ў сферы электроннага біржавога гандлю, займаючы другое месца пасля Расіі па аб'ёмах узаемнага таваразвароту.

Дарэчы, сёлета за 9 месяцаў сума здзелак кітайскіх рэзідэнтаў на Беларускай універсальнай таварнай біржы дасягнула 127 мільёнаў долараў ЗША, што на 11 % больш, чым за аналагічны перыяд летась. Паралельна расце і колькасць кітайскіх удзельнікаў біржавых таргоў. З пачатку года іх стала на 68 больш, і на сённяшні дзень на БУТБ акрэдытаваныя 315 кампаній з КНР, уключаючы чатырох брокераў.

Такія лічбы прывёў **намеснік начальніка ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці БУТБ Герман ПУЗЫРНЫ**, выступаючы ў рамках сесіі «Практычныя аспекты ўзаемадзеяння з кітайскімі контрагентамі» на Брэсцкім эканамічным форуме-практыкуме «Стратэгічны партнёр — Кітай». Мерапрыемства сабрала вядучых экспертаў з Беларусі, Кітая і Расіі, а таксама звыш 120 прадстаўнікоў дзелавой супольнасці, якія ўжо працуюць з КНР або толькі плануюць выйсці на рынак Паднябеснай.

— Пры прапрацоўцы кітайскага кірунку біржавога гандлю мы ўжылі комплексны падыход, што дазволіла за адносна кароткі перыяд дасягнуць жаданага выніку. Наяўнасць супрацоўнікаў з веданнем кітайскай мовы, прадстаўніцтва ў Шанхаі, сетка біржавых брокераў-рэзідэнтаў КНР, магчымасць разлікаў у юанях, спецыяльныя экспартныя гандлёвыя сесіі для Кітая — усё гэта дапамагло падабраць ключ да рынку Паднябеснай і прыцягнуць кітайскі бізнес на біржу, — адзначыў Герман Пузырны.

Пры гэтым, на думку прадстаўніка БУТБ, перспектывы развіцця супрацоўніцтва Беларусі і Кітая ў біржавой сферы каласальныя.

— Сёння з выкарыстаннем біржавога механізму ў Кітай пастаўляюцца беларускія піламатэрыялы і цэлюлоза, мясамалочная прадукцыя і льняное валакно. Гэта падмурак біржавога гандлю з КНР, які мы пастаянна ўмацоўваем, нарошчваючы аб'ёмы здзелак і пашыраючы пул кітайскіх пакупнікоў. Разам з тым у Беларусі ёсць нямала таварных пазіцый, пакуль яшчэ не ўцягнутых ва ўзаемны біржавы гандаль з Кітаем, якія маглі б стаць новымі пунктамі росту. Тут маюцца на ўвазе не сыравінныя тавары, а гатовая прадукцыя з высокай дабаўленай вартасцю, — падкрэсліў Герман Пузырны.

# «ЕЎРАГАНДАЛЬ» ПЕРШЫ Ў БЕЛАРУСІ ЗАПУСКАЕ ЛІЧБАВУЮ СІСТЭМУ ПРАВЕРКІ ЎЗРОСТУ ПАКУПНІКОЎ



Выява носіць ілюстрацыйны характар.

Кампанія «Еўрагандаль» запусціла лічбавую праверку ўзросту пры куплі тавараў з заканадаўчымі абмежаваннямі на касах самаабслугоўвання. Гэта робіць працэс пакупак у крамах «Еўраопт» і «Хіт!» яшчэ больш простым, зручным і хуткім. Цяпер пацвердзіць паўналецце можна з дапамогай QR-кода ў дадатку «Еплюс».

Гаворка ідзе аб тэхналогіі на базе мабільнага дадатку «Еплюс» і міжбанкаўскай сістэмы ідэнтыфікацыі (МСІ) — лічбавай платформы, якая забяспечвае праверку даных аб асобе і ўзросце карыстальніка. Пакупніку дастаткова адзін раз пацвердзіць узрост — і пасля больш не патрабуецца кожны раз прад'яўляць пашпарт. Пацверджаны статус захоўваецца ў дадатку «Еплюс», а для пакупак дастаткова паказаць QR-код на касе самаабслугоўвання (КСА) у крамах «Еўраопт» і «Хіт!».

### ЯК ГЭТА ПРАЦУЕ ПРЫ ПАКУПКАХ НА КАСАХ САМААБСЛУГОЎВАННЯ

Крок 1.

**Крок 1. Верыфікацыя ў дадатку «Еплюс»**

У раздзеле «Узрост» карыстальнік праходзіць праверку праз Міжбанкаўскую сістэму ідэнтыфікацыі (МСІ) — платформу для дыстанцыйнай верыфікацыі асобы і ўзросту. Пацвярджэнне патрабуецца выканаць толькі адзін раз, пасля чаго статус захоўваецца ў дадатку.

Крок 2.

**Крок 2. Купля на касе самаабслугоўвання**

Калі тавар падлягае ўзроставаму кантролю, пакупніку дастаткова паказаць QR-код з дадатку «Еплюс». Праверка праходзіць практычна імгненна.

Калі верыфікацыя ў дадатку «Еплюс» не пройдзена, узрост пацвярджаецца ў стандартным парадку супрацоўнікам зоны кас самаабслугоўвання.

### ПЕРАВАГІ ДЛЯ ПАКУПНІКОЎ

**Імгненнае абслугоўванне**

Аднаразовая верыфікацыя ўзросту ў дадатку «Еплюс» дазваляе забыцца пра неабходнасць выклікаць і чакаць спецыяліста кас самаабслугоўвання: пацвярджэнне ўзросту займае ўсяго адну-дзве секунды, і ўвесь час вы можаце прысвяціць пакупкам.

**Поўная канфідэнцыяльнасць**

Даныя карыстальніка захоўваюцца ў Міжбанкаўскай сістэме ідэнтыфікацыі (МСІ) і не перадаюцца трэцім асобам. Пакупнік абаронены ад залішняга збору персанальных даных.

**Павышаная надзейнасць праверкі**

Тэхналогія гарантуе дакладнасць верыфікацыі: менш памылак пры ўводзе даных і магчымасць аўтаматычнага абнаўлення статусу пры замене дакумента або дасягненні новай узроставай мяжы.

**Падтрымка персаналу**

Усе аперацыі фіксуюцца ў сістэме, адміністратар зоны самаабслугоўвання бачыць статус праверкі і можа кантраляваць працэс, што зніжае нагрузку на супрацоўнікаў.

### Каментарый кампаніі

«Еўрагандаль» традыцыйна выступае піянерам лічбавай трансфармацыі беларускага рытэйлу і заўсёды імкнецца рабіць пакупкі найзручнейшымі. Мы першыя ўкаранілі мабільныя плацяжы ў дадатку «Еплюс», а сёння тэсціруем лічбавую верыфікацыю ўзросту на базе платформы МСІ. Наша мэта — каб кожны паход у краму быў максімальна просты і хуткі, а тэхналогіі працавалі на вас», — адзначыў **Віталь БОЙКА, дырэктар па інфармацыйных тэхналогіях і кібербяспецы ТАА «Еўрагандаль».**

УНП 101168731

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Молочный мир», г. Гродно, ул. Гаспадарчая, 28. УНП 500040357 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов:**
бывшее в употреблении имущество.
Местоположение – г. Гродно, ул. Гаспадарчая, 28

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| **1** | **Грузовой специальный фургон-рефрижератор MAZ-5336A5, регистрационный номер АЕ 0262-4**, 2011 г. в. | **11 232,00** |
| **2** | **Грузовой специальный фургон-рефрижератор MAZ-5336A5, регистрационный номер АЕ 0261-4**, 2011 г. в. | **11 232,00** |

***Цена снижена на 20 %. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены***

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 6 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.09.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 27.10.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **24.10.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42.
E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов: ООО «ТрастАудитКонсалт» (УНП 692017051), 222304, Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14, тел. (8029) 777-91-61.
Публичные торги в форме аукциона в процедуре ликвидации будут проведены **24.10.2025 г. 16.00**
по адресу: г. Минск, ул. Максима Богдановича, д. 70, пом. 1Н.

**Продавец: ООО «МилкПрофТрейдинг» (УНП 191764709)
(Продавец является плательщиком НДС)**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС (20 %), BYN |
|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798802540, площадь – 14,6 кв. м, наименование – Административное помещение, назначение – Административное помещение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Ратомская, 50-112, с комплектом мебели согласно Спецификации 1. Помещение сдано в аренду до 31.12.2025 | 71820 |
| 2 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798802541, площадь – 10,6 кв. м, наименование – Административное помещение, назначение – Административное помещение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Ратомская, 50-113, с комплектом мебели согласно Спецификации 2. Помещение сдано в аренду до 31.12.2025 | 54540 |
| 3 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798802542, площадь – 106,2 кв. м, наименование – Административно-торговое помещение, назначение – Административно-торговое помещение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Ратомская, 50-114, с комплектом мебели согласно Спецификации 3. Помещение сдано в аренду до 30.09.2026 | 480600 |
| 4 | Изолированное помещение с инвентарным номером 700/D-7374, площадь – 1139,40 кв. м, наименование – Встроенное помещение, назначение – вспомогательное (подсобное) помещение, не относящееся к жилищному фонду, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Пионерская, 37-65, в капитальном строении с инвентарным номером 700/С-1484 | 903600 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 7779161.
Дополнительные сведения об имуществе, спецификациях и порядке проведения аукциона опубликованы: https://cloud.mail.ru/public/QeW4/AnQUiUrjr
**Для участия в торгах необходимо в срок до 18.00 20.10.2025:**
1) зарегистрироваться и подать заявление на участие в публичных торгах по выбранному лоту и соглашение о задатке по электронной почте info@truster.by либо по адресу: 222304, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14;
2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY88 UNBS 3012 2173 7000 0000 0933 в ЗАО «БСБ Банк», BIC: UNBSBY2X, получатель – ООО «ТрастАудитКонсалт», УНП 692017051.
Шаг торгов – 5 %, задаток – 1 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов.
Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 4 % от начальной цены предмета торгов в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 календарных дней со дня проведения торгов, но не ранее возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 30 рабочих дней со дня проведения торгов.
*Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 19.08.2025.*

# СПАДЧЫНА І ТЭХНАЛОГІІ

## Чым здзіўлялі на міжнароднай выстаўцы BTI-2025, якая прайшла ў сталіцы?





Нават не ведала, што ў нас у Беларусі столькі стыльных прадстаўніц прыгожага полу. І гаворка не пра паказы на подыуме. Сярод наведвальніц Міжнароднай выстаўкі-кірмашу па аптовым продажы тавараў лёгкай прамысловасці сёлета канцэнтрацыя стылю проста зашкальвала. Зрэшты, здзіўляцца няма чаму: форум сабраў у Мінскім міжнародным выставачным цэнтры людзей, для якіх мода і стыль — прафесія (ну, або, прынамсі, сфера цікавасці і вывучэння): мадэльераў і дызайнераў, прадстаўнікоў вядучых брэндаў і студэнтаў творчых ВНУ, якія будуць развіваць гэтыя брэнды ў далейшым. 49-я Міжнародная выстаўка-кірмаш па аптовым продажы тавараў лёгкай прамысловасці BTI-2025 аказалася шмат у чым непадобнай да папярэдніх.

### ПАД ЗНАКАМ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Упершыню гэтая выстаўка праходзіла ў інавацыйным будынку ММВЦ. Сёлета гэта абноўлены праект з шырокай галерэяй новых калекцый, насычаным дзелавым кантэнтам і імкненнем зірнуць свежым поглядам на сусветныя тэндэнцыі і ўласны шлях развіцця ў сектары вытворчасці моднага адзення, абутку і аксесуараў. Пра тое, што выстаўка сёлета асаблівая, казала, адкрываючы форум, **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА**: «Імкнуліся адлюстраваць дзве тэмы. Тое, што захоўваем традыцыі, беражом культурную спадчыну, і тое, як укараняем сучасныя тэхналогіі, выкарыстоўваем новыя тканіны. Лёгкая прамысловасць Беларусі разумее сваё месца ў гэтым высокаканкурэнтным свеце».

Дарэчы, аб канкурэнцыі, якая ў сферы лёгкай прамысловасці была заўсёды, а сёння як ніколі высокая. Сваю прадукцыю на BTI, акрамя беларускіх прадпрыемстваў, прэзентавалі вытворцы з Расіі, Кітая, Узбекістана — усяго больш за 70 экспанентаў. І прывезлі яны на выстаўку, зразумела, найлепшае. Так што прыдзірліваму і патрабавальнаму сучаснаму модніку было з чаго выбіраць і з чым параўноўваць. Зрэшты, дэвіз сёлета — «Дыялог бізнесу і моды»: форум прайшоў ў кантэксце не жорсткай канкурэнцыі, а пад знакам супрацоўніцтва і калабарацыі. Таму і адкрыў форум паказ калекцыі «Прамень сонца залатога», сумесная работа Беларускага цэнтра моды і расійскага брэнда «Таржокскія залаташвеі». Сярод іншых флагманскіх праектаў была калекцыя канцэрна «МАЗ-СПОРТаўта: экіпіроўка новага ўзроўню», мерч для фіналістак конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь-2025», Family Look ад беларускіх вытворцаў. Упершыню кейс-сесія беларускіх брэндаў прайшла ў фармаце нон-стоп-прэзентацыі.

### БЫЦЬ ПЕРШЫМІ

У сваёй прывітальнай прамове **міністр прамысловасці Беларусі Андрэй КУЗНЯЦОЎ** назваў беларускую лёгкую прамысловасць адным з брэндаў дзяржавы. А знакамітыя беларускія брэнды ў нашай краіне (ды і ў краінах СНД) пералічыць хто заўгодна: «Элема», «Камволь», «Мілавіца», «Камінтэрн», «Калінка», «Купалінка», «Славянка»... Але заставацца брэндам пры такім багацці прапаноў, зразумела, няпроста. Што для гэтага трэба?



— Быць першымі, — адзначае прадстаўнік ААТ «Камінтэрн» спецыяліст па продажах Вікторыя Каршанкова. — Сачыць за тэндэнцыямі, інавацыямі і, вядома, за якасцю тканін і вырабаў. Гэта велізарны аб'ём працы, якая складаецца з многіх кампанентаў.

Вельмі важна рабіць акцэнт на інавацыі, распавяла маркетолаг СП ЗАТ «Мілавіца» Наталля Міганові. Прыклад — адна з калекцый, дзе ў найтанчэйшыя карункі ўплецены мікрапаеткі. Яшчэ адна інавацыя — фэшн-калекцыя, дзе ў малюнак вышыўкі ўкладваецца фальгіраванае палатно, і атрымліваецца галаграфічны эфект.



Калі казаць пра аксесуары, то перавагі беларусак падобныя да выбару еўрапейскіх модніц, расказала начальнік аддзела рэкламы ААТ «Галантэя» Ганна Шастак. «У гэтым сезоне асаблівы акцэнт — матэрыялам, формам і колеравай гаме ў вінных, шакаладных, шэра-карычневых, аліўкавых тонах. Таксама ёсць велюры з фактурамі: пад пітона, з анімалістычнымі прынтамі.

Ноу-хау — «касматыя» велюры. Такія «хуліганскія» сумкі дадаюць вобразу моднай гранжавасці, ствараюць расслаблены і прадумана-нядбайны вобраз. «А яшчэ «касматы» велюр вельмі прыемны тактыльна, — кажа суразмоўца. — Тое, што трэба ў восеньскі дэпрэсіўны перыяд: пагладзіш пальцамі такую сумку — і, глядзіш, настрой палепшыцца».

Што датычыцца вячэрняй калекцыі сумак, то сёння гэта не толькі клатчы. Вячэрнія сумкі становяцца ёмістымі, а святочная «накіраванасць» падтрымліваецца за кошт элементаў дэкору і акцэнтнай фурнітуры.

### НОВЫ ПОГЛЯД

Асаблівая ўвага сёлета на BTI была ўдзелена беларускім брэндам, якія раней спажывец мог ацаніць толькі ў трэнд-парках або анлайн. Іх калекцыі можна было ўбачыць «ужывую» і нават прымераць. Некаторыя дызайнеры працавалі ў фармаце шоу-рума, большасць — у межах паказаў на подыуме. Напрамкі калекцый былі самымі рознымі: ад цалкам «насібельных» вобразаў да фармату «Мода як від сучаснага мастацтва».

— Прывезла на выстаўку сваю калекцыю «Савіцкія мадонны», — расказала кіраўнік Тэатра моды «Новы погляд» Мінскага дзяржаўнага каледжа лёгкай прамысловасці і комплекснай лагістыкі Святлана Івашына.

Калекцыя з вышыўкай у тэхніцы алмазнай мазаікі прымеркавана да 80-годдзя Вялікай Перамогі, патлумачыла вядомы дызайнер.

— Гэта вобраз Перамогі ў маім асабістым «прачытанні». Прысвечана калекцыя народнаму мастаку Міхаілу Андрэевічу Савіцкаму, яго творчаму і жыццёваму шляху. Мне хацелася расказаць пра яго людзям — у першую чаргу маладым, некаторыя з якіх наогул «не ў тэме». На маіх вырабах — жаночыя партрэты з палотнаў Савіцкага. Менавіта жаночым выявам у яго творчасці мастацтвазнаўцы ўдзяляюць мала ўвагі, а, між тым, яны вартыя навуковых прац. Так што гэта мае прысвячэнне жанчынам Перамогі — тым, хто змагаўся з фашызмам і аднаўляў краіну.

Застаецца дадаць, што моладзь, узаемадзеянне з ёй — з будучымі прафесіяналамі моды, ад дызайнераў да швачак, — было адным з прыярытэтаў сёлетняй выстаўкі BTI. Для школьнікаў і студэнтаў арганізоўваліся сустрэчы з дызайнерамі і майстрамі, дыялогавыя пляцоўкі. Бо мода і стыль — гэта не толькі пра тое, «чым папоўніць гардэроб у новым сезоне». Як адзначыла на сваёй лекцыі ў межах дзелавой праграмы форуму прадстаўнік Беларускага саюза дызайнераў Таццяна Фядосава, мода ў яе культуралагічным сэнсе — гэта асаблівая мова. Мова, на якой гаворыць эпоха.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Андрэя ПУГАЧА.**





ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Третьи повторные публичные торги в форме электронного аукциона. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 18.09.2025 в газете «Звязда» № 180 (30568), стр. 11**

**Предмет публичных торгов (электронного аукциона)**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС 20 % | Минимальная цена, бел. руб., с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Линия по производству материалов для прозрачных настольных покрытий и искусственных кож | 1 180 140,00 | 236 028,00 |

**Задаток:** 5 % от начальной цены предмета электронного аукциона. **Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота (не изменяется в ходе торгов)

Задаток перечисляется в белорусских рублях на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – ООО «Индустрия Инноваций».
Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения электронного аукциона, информация об имуществе размещены на официальном сайте ЭТП «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by.
**Электронный аукцион состоится 21.10.2025, начало: 10.00, окончание: 16.00 на электронной торговой площадке iintorgi.by.
Время приема заявок: с 11.10.2025 по 20.10.2025 г. до 17.00**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

ДОПОЛНЕНИЕ
К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ
ООО «РЕТОРСИЯ ТРЕЙД»,
***опубликованной в газете «Звязда» от 19.09.2025 г.,***
по объекту
«Строительство жилого района с объектами инженерно-транспортной инфраструктуры в районе д. Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области».
**Жилой дом № 12 по ГП.**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 12 по генплану предлагаются:
**3 (три)** однокомнатные квартиры **площадью 34-35 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 600 до 5 960 белорусских рублей;**
**3 (три)** однокомнатные квартиры **площадью 40-44 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 408 до 5 768 белорусских рублей;**
**1 (одна)** двухкомнатная квартира **площадью 53-54 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 248 до 5 608 белорусских рублей;**
**6 (шесть)** двухкомнатных квартир **площадью 62-64 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 704 до 5 096 белорусских рублей;**
**2 (две)** двухкомнатные квартиры **площадью 81-82 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 544 до 4 904 белорусских рублей.**
В организации действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.
Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.
**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3-7 календарных дней либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей с даты регистрации договора в местном исполнительном распорядительном органе.
Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Вилладж» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику пн.–пт. с 9.00 до 19.00, сб. с 10.00 до 16.00, вс. – выходной, либо на сайте grand-village.by.
Тел. офиса продаж +375 (29) 177-00-22.
Прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться в порядке живой очереди с 9.00 13.10.2025 г.
УНП 691310944

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
**12.11.2025**

**Лот № 1.** Электротехническая продукция
(полный перечень продукции представлен на электронной торговой площадке «GOSTORG»).
Начальная цена без НДС – 12 000,00 руб.
Задаток – 1 200,00 руб.

**Лот № 2.** Электротехническая продукция
(полный перечень продукции представлен на электронной торговой площадке «GOSTORG»).
Начальная цена без НДС – 4 0000,00 руб.
Задаток – 400,00 руб.

Продавец – гражданин Республики Беларусь.
Местонахождение: г. Минск, ул. Солтыса, 106.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом ЭТП.
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **10.11.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,
torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

# «ГАЛОЎНАЕ, ЛЮДЗІ РАЗВІВАЮЦЦА І ЗАСТАЮЦЦА Ў КУЛЬТУРЫ»

## Як працуе «кузня кадраў» для творчай сферы

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў адзначае сёлета свой 50-ы юбілей. Навучальная ўстанова даўно зарэкамендавала сябе як месца, дзе якасна рыхтуюць кадры для культурнай сферы нашай краіны. На чатырох факультэтах, а таксама ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў сёння рыхтуюць студэнтаў па 16 спецыяльнасцях (29 прафілізацыях). А мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» і ўласны спартыўна-культурны цэнтр даюць студэнтам прастору для ўсебаковай рэалізацыі іх талентаў. Пра сённяшні дзень універсітэта і яго перспектывы размаўляем з рэктарам БДУКМ Наталляй КАРЧЭЎСКАЙ. Наша гутарка адбылася якраз у час святкавання юбілею і напярэдадні прафесійнага свята — заўтра адзначаецца Дзень работнікаў культуры.



З прафесійным святам работнікаў культуры павіншаваў Прэзідэнт Беларусі. У віншаванні адзначаецца, што сёння ў сферы культуры працуюць тысячы выдатных спецыялістаў, энтузіястаў сваёй справы.

«Дзякуючы вашай плённай нястомнай дзейнасці і імкненню да пашырэння творчых гарызонтаў нашу краіну ведаюць далёка за яе межамі.

Упэўнены, што і надалей сваімі талентам, вопытам і захопленасцю вы будзеце рабіць значны ўнёсак у развіццё Беларусі, выхоўваць у падрастаючага пакалення любоў да родных вытокаў і патрыятызм, умацоўваць суверэнную беларускую дзяржаву», — гаворыцца ў віншаванні.

### «НАШЫ ВЫПУСКНІКІ — УСЮДЫ»

***— Ужо месяц, як пачаўся новы навучальны год. Якой выдалася ўступная кампанія ў вашай ВНУ?***

— Сёлета яна запомнілася тым, што вырас конкурс і прахадныя балы. Гэта сведчыць, з аднаго боку, што адукацыя запатрабаваная, карыстаецца папулярнасцю ў абітурыентаў і іх бацькоў, а з другога — сведчыць пра якасць падрыхтоўкі ў тых установах, дзе вучыліся нашы абітурыенты да прыходу ва ўніверсітэт. І мы ўдзячныя тым, хто рыхтуе нам будучых студэнтаў. Вельмі важна і тое, як людзі здаюць ЦТ. Ёсць спецыяльнасці, дзе абітурыенты здаюць ЦТ па трох прадметах,адпаведна, там вельмі высокія балы. Гэта таксама радуе, бо я глыбока перакананая, што ў культуры павінны працаваць высокаадукаваныя людзі.

На спецыяльнасцях, дзе здаецца дысцыпліна «Творчасць», усё крыху па-іншаму. Там важная роля спецыяльных здольнасцяў, а людзі, якія праявілі сябе ў рэспубліканскіх ці міжнародных конкурсах, з'яўляюцца іх пераможцамі альбо лаўрэатамі, ці ўнесены ў банк даных таленавітай моладзі, могуць да нас паступаць і без уступных іспытаў. Адзначу, па выніках першага месяца такія студэнты вельмі прыстойна вучацца. У верасні студэнты ўжо паспелі паўдзельнічаць у шэрагу знакавых для нашай краіны мерапрыемствах: Дні народнага адзінства, Дні беларускага пісьменства і іншых. Студэнты былі там і ўдзельнікамі, і гледачамі, і валанцёрамі. Ім, як самі прызнаюцца, гэта падабаецца.

### СПЕЦЫЯЛІСТА ЗАКАЗВАЙЦЕ ЗАГАДЗЯ

***— Вы адзначалі, што сёлета выраслі балы і конкурс. На якія спецыялізацыі ўбачылі найбольшы попыт?***

— Аказалася запатрабаванай і істотна вырас конкурс на «Бібліятэчна-інфармацыйную дзейнасць». Гэта спецыялізацыя


## Извещение о проведении 29 октября 2025 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 600/С-122808 общей площадью 24,4 кв. м (наименование: помещение насосной станции мазута; составные части и принадлежности: кирпичное здание помещения насосной станции мазута 3А1/к, с резервуарами под мазут а1) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 0,0774 га, кадастровый номер – 623650100001005578 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/3 |
| Начальная цена: 100 000,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 10 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к.10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **29 октября 2025 года в 11.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб.7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.10.2025 по 27.10.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону: (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**



## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Добрушского РайПО (продавец) извещает о проведении 31 октября 2025 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 311/С-51601, общей площадью 344,0 кв. м, наименование – Магазин № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание магазина, с надворными постройками: складом, уборной. Капитальное строение с инв. № 311/С-51602, общей площадью 56,0 кв. м, наименование – Склад, назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание склада

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321282808301000125 площадью 0,1576 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, д. Хорошевка, ул. Юбилейная, 1А

**Начальная цена** продажи с НДС – 2 658,00 бел. руб.
**Задаток** – 26,58 бел. руб.

**Лот № 2:** Капитальное строение с инв. № 311/С-52024, общей площадью 141,9 кв. м, наименование – Магазин № 14, назначение – Здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой и котельной здание магазина. Капитальное строение с инв. № 311/С-52023, общей площадью 17,1 кв. м, наименование – Гараж, назначение – Здание специализированное транспорта, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание гаража. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды

